**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**«Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «АРТ» г. Мінска»**

# Інтэрактыўны дзіцячы спектакль
# «Любая Свіслач»
***(паводле легенд беларускай міфалогіі)***

*Аўтар: Варакса Ганна Георгіеўна, педагог дадатковай адукацыі, вышэйшай катэгорыі*
*Намінацыя: «Арыгінальны драматургічны матэрыял для дзіцячага тэатра» (для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту)*

Мінск 2023

АНАТАЦЫЯ

*Матэрыял інтэрактыўнага дзіцячага спектакля «Любая Свіслач», напісаны па матывах беларускіх легенд і міфаў. Гэта выдатная казка пра каханне, сяброўства, дабро і зло, пра беражлівыя адносіны да роднай прыроды і краю. Глядач становіцца непасрэдным удзельнікам усіх падзей: ён гуляе, танчыць, спявае, дапамагае прайсці ўсе выпрабаванні галоўнаму герою. Матэрыял адрасаваны дзецям малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту.*

# ВІЗІТОЎКА АЎТАРА

Варакса Ганна Георгіеўна працуе ў дзяржаўнай установе адукацыі«Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «АРТ» г.Мінска» з 03.01.2000 на пасадзе педагога дадатковай адукацыі ўзорнага тэатра фальклорнай гульні «Скамарохі».

Ганна Георгіеўна валодае прафесіянальнымі педагагічнымі ведамі па свайму прадмету, выкладае асновы акцёрскага майстэрства, сцэнічнай мовы, пластыкі і вядзення гульнёвых праграм. Арганізацыя і правядзенне народных святаў, вулічных прадстаўленняў, дзіцячых гульнёвых праграм і спектакляў з'яўляецца асноўным напрамкам дзейнасці калектыва.

Узнагароды: Ганаровая грамата ўпраўлення адукацыі адміністрацыі Першамайскага района г.Мінска, 2008 (загад ад 27.08.2008 №87-к);

Падзяка ўпраўлення адукацыі адміністрацыі Першамайскага района г.Мінска, 2009 (распараджэнне ад 18.09.2009 №191-л);

Ганаровая грамата камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама, 2012 (загад ад 20.08.2012 № 213/1-к);

Падзяка Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2014 (загад ад 01.04.2014, №99-к);

Ганаровая грамата камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама, 2018 (загад ад 14.08.2018, №80-к);

Грамата міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, 2018 і падзяка міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, 2018 (загад ад 16.03.2018, №73-к)

Педагог з'яўляецца шматразовым удзельнікам і пераможцам міжнародных, рэспубліканскіх, гарадскіх і раённых мерапрыемстваў:

- дыплом Мінскага гарадскога камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі, фіналіста ў гарадскім этапе рэспубліканскага конкурсу педагагічнага майстэрства «Сталічны настаўнік – сталічнай адукацыі» у намінацыі «Педагог года дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі», 2016;
- падзяка ўпраўлення адукацыі, спорта і турызму адміністрацыі Першамайскага района г.Мінска за асаблівы ўклад у развіццё творчых здольнасцяў навучэнцаў, 2017;
- ганаровая грамата адміністрацыі Першамайскага раёна г.Мінска за высокі ўзровень прафесійнага майстэрства і актыўны ўдзел у грамадска значных мерапрыемствах Першамайскага раёна, 2018;
- дыплом I ступені Мінскага гарадскога фестываля мастацкай і інтэлектуальнай творчасці «Мой Мінск - мая сталіца – творчасці і таленту крыніца!», МГІРА, 2019;
- дыплом II ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь рэспубліканскага дзіцячага конкурса «Гуляюць дзеці – гуляем мы!», НДАЛ «Зубраня», 2020;
- дыплом III ступені камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама гарадскога фестываля-конкурсу тэатральных і лялечных калектываў «Амплуа», 2020;
- дыплом ГРАН-пры і лаўрэата I ступені, міжнароднага конкурсу-фестывалю дзіцячай і юнацкай творчасці «На сямі вятрах», г.Стаўрапаль. 2021;

- дыплом III ступені Мінскага гарадскога фестываля мастацкай і інтэлектуальнай творчасці «Мой Мінск - мая сталіца – творчасці і таленту крыніца!», МГІРА, 2023;

У кастрычніку 2022 года ўзорнаму тэатру фальклорнай гульні «Скамарохі» споўнілася 35 гадоў. Шматлікія выпускнікі калектыву працягваюць шлях свайго настаўніка і прафесійна займаюцца тэатральна-педагагічнай дзейнасцю.

Ганаровае званне «узорны» калектыў пацвярждаў у рамках фестывалю народнай творчасці «Сузор’е»: 2020-2021 –дыплом лаўрэата I ступені.

## Інтэрактыўны дзіцячы спектакль «Любая Свіслач»

***Дзеючыя асобы:***

***Дзед Барадзед*** – казачны гном
***Вадзянік*** – кароль падводнага каралеўства
***Дочкі Вадзяніка*** – 5-6 дзяўчын
***Свіслач*** – любімая дачка Вадзяніка
***Жабяняты*** – 5-6 стражнікаў
***Прынц Менеск*** – чалавек
***Вялес*** – бог гандлю
***Пярун*** – бог грамавержыц
***Жыжаль*** – падземны бог агню

*/Пад чароўную музыку выходзіць Дзед Барадзед і спявае песню «Дзед Барадзед», музыка Леаніда Захлеўнага, словы Артура Вольскага/*

***Дзед Барадзед:*** Я хаджу па белым свеце
І гляджу, як вы жывеце.
Калі трэба – памагу,
Бо я ўсё рабіць магу.
***Прыпеў:*** Хто я? Дзед Барадзед,
Абышоў белы свет,
А цяпер у ціхі час
Завітаў да вас.
З вамі побач буду ўсюды,
Трэба цуды – зробім цуды,
Трэба казка – раз, два, тры,
Вось і казка вам, сябры!

Вы чакаеце, калі я казку пачну,
Ну, што ж, мы адпраўляемся з вамі ў краіну,
Дзе богі, прынцэсы жывуць і кароль,
Няма вымыслу, праўдзе галоўная роль.

Каб апрануцца ў казачнай краіне, трэба выканаць мае заданні. Прашу ўсіх устаць са сваіх месцаў і паўтараць ўсе за мной.

*/Гульня з залай «Падарожжа»/*

- Выходзім з хаты і ідзём па сцяжынцы – тупаем нагамі */гледачы выконваюць/*;
- Зварочваем на прасёлкавую дарогу, лісце шамаціць пад нагамі – коўзаем нагамі */гледачы выконваюць/*;
- Наперадзе рака, ідзем па пяску – шаркаем далонь аб далонь */гледачы выконваюць/*;
- А зараз па драўляным мастку пераходзім цераз раку – пляскаем далонямі па каленях */гледачы выконваюць/*;
- Дрэвы кругом вялікія, калыхаюцца – рукі над галавой */гледачы выконваюць/*;

Вось мы і апынуліся на казачным скрыжаванні. Мне казалі, што на казачных скрыжаваннях здараюцца розныя дзіўнасці і цуды. Цішэй, нехта ідзе! */Хаваецца./*

*/Выходзячь дочкі Вадзяніка і Вадзяннік./*

***Дачка 1:*** Выйсці замуж хачу!

***Дачка 2:*** За самага багатага бога!

***Дачка 3:*** Каштоўныя каменні хачу!

***Дачка 4:*** Падарункі дарагія!

***Дачка 5:*** Убранні модныя!

***Дачка 6***: Убранні модныя!

***Дочкі*** */разам/*: Хачу, хачу! Дзе твае жаніхі? Дзе богі? Няўжо гэта шкодная Свіслач усіх напалохала!

***Вадзянік:*** Хопіць вам гудзець, галава баліць ад вас, да і душа таксама.

*/Забягае дачка Свіслач./*

***Дачка Свіслач:*** Тата, татачка! Там, побач з нашым каралеўствам поле гіне! Дапамажы, яму патрэбна вада!

***Вадзянік:*** Не магу, на ўсё свой час, дачка мая любая.

***Дачка Свіслач:*** Але полю патрэбна вада. Я не магу іх кінуць. Там людзі!

***Дочкі*** */разам/*: Людзі?!

***Вадзянік:*** Людзі?! Далей ад людзей! Крынічка мая любая, кропелька мая сонечная, празрыстае мае шкельца!

***Дачка Свіслач:*** Калі ты не хочаш іх вызратаваць, то я сама гэта зраблю. Бо там мой каханы. */Уцякае./*

***Вадзянік:*** Хто ён? Ён чалавек? */Хапаецца за галаву, бяжыць за ёй./* Свіслач, Свіслач, дачка мая любая.

***Дачка 1:*** Гэй, хто-небудзь!

***Дачка 2:*** Нам сумна!

***Дачка 3:*** Хутчэй сюды каралеўскіх дачок весяліць!

*/З'яўляюцца жабаняты –стражнікі./*

***Усе жабаняты:*** Чаго жадаеце?

***Жабяня 1:*** Можа казку?

***Дачка 4:*** Абрыдлі вашы казкі!

***Жабяня 2:*** Можа песню жалобную?

***Дачка 5:*** Зноў, як жабы выць будзеце: «Ква-аа, ква-ква-ааа!». Цьфу!

***Жабяня 3:*** Можа станчыць жадаеце?

***Дачка 6:*** Да вы акрамя карагоду вакол гнілога дрэва нічога не ведаеце. Сумна, мне сумна.

***Дочкі*** */разам/*: Сумна, нам сумна.

***Жабяня 4:*** Мы былі наверсе і бачылі, як людзі гулялі.

***Жабяня 5.:*** Нам падабалася гэтая гульня, і мы яе запомнілі.

***Дочкі*** */разам/*: Хачу гуляць у гульню! Хачу! Хачу! */Тупаюць нагамі./*

***Жабяня 6:*** Добра, добра, нельга так раўсці.

***Жабяня 1:*** А то ўся вада з берагоў выцячэ.

***Дачкі*** */разам/*: Давай хутчэй, пачынай.

***Усе жабняты:*** Добра, добра!

*/Гульня з залай «І мы гэтак!»/*

***Жабяня 2:*** Мы будзем па чарзе казаць некаторыя сказы, а вы павінны адказваць: «І мы гэтак!».
***Жабяня 3:*** Давайце паспрабуем.
***Дочкі*** */разам/*: І мы гэтак!
***Жабяня 4:*** А гледачы вам дапамогуць! Давайце паспрабуем усе разам. */Адказ гледачоў: «І мы гэтак!»/*
***Жабяня 5:*** Мы ішлі каля канаўкі ... */Адказ гледачоў: «І мы гэтак!»/*
***Жабяня 6:*** Квакалі ў балоце жабкі... */Адказ гледачоў: «І мы гэтак!»/*
***Жабяня 1:*** Рос масляк каля дубочка... */Адказ гледачоў: «І мы гэтак!»/*
***Жабяня 2:*** Быў ен тоўсты, нібы бочка... */Адказ гледачоў: «І мы гэтак!»/*
***Жабяня 3:*** Потым мы ў лес пайшлі... */Адказ гледачоў: «І мы гэтак!»/*
***Жабяня 4:*** У лесе два асла раўлі... */Адказ гледачоў: «І мы гэтак!»/*
***Жабяня 5:*** Зайчаня дрыжаў пад елкай... */Адказ гледачоў: «І мы гэтак!»/*
***Жабяня 6:*** На сасне гойсала вавёрка... */Адказ гледачоў: «І мы гэтак!»/*
***Жабяня 1:*** Бобік гнаўся за катом... */Адказ гледачоў: «І мы гэтак!»/*
***Жабяня 2:*** Ды віляў сваім хвастом... */Адказ гледачоў: «І мы гэтак!»/*
***Жабяня 3:*** Кошка Мурка мышку ела... */Адказ гледачоў: «І мы гэтак!»/*
***Жабяня 4:*** Вельмі есці захацела... */Адказ гледачоў: «І мы гэтак!»/*
***Дачка 1:*** Ох, як хораша людзі ўмеюць весяліцца!
***Дачка 2:*** А у нас кожны дзень адно і тое ж.
***Дачка 3:*** Да і замуж ніхто не бярэ.
***Дачка 4:*** А ўсё гэтая Свіслач.
***Дачка 5:*** То ёй не так, гэта гэтак.
***Дачка 6:*** А пра нас зусім не думае.
***Дачка 1:*** Усё аб сабе, да аб сабе.
***Дачка 2:*** Ды яшчэ аб гэтых людзях клапаціцца.
***Дачкі*** */разам/:* Цьфу!

*/Забягае Вадзянік і дачка Свіслач./*

***Вадзянік:*** Цыц! Усе падрыхтаваліся. Косы разгладзілі, галоўкі паднялі, адзенне паправілі. Да нас едуць жаніхі!
***Дочкі*** */разам/:* Жабяняты псік, псік адсель!

*/На сцэну ўваходзяць важна богі Пярун, Вялес і Жыжаль/*

***Пярун:*** Добры дзень, вялікі кароль Вадзянік. Добры дзень, дочкі вялікага караля. Я – Пярун, бог нябеснага агню, адным ударам разбіваю хмары, і вада імклівa льецца на зямлю.
***Вялес:*** Я – Вялес бог гандлю і багацця, заступнік і апякун земляробства, а таксама хатняй жывёлы.
***Жыжаль:*** Я – Жыжаль, бог падземнага агню, калі я захачу, то магу спаліць зямлю, знішчыць лясы, выпаліць сенакосы, асушыць агароды.
***Пярун:*** Мы прыйшлі прасіць рукі тваёй самай прыгожай і каханай дачкі Свіслачы.
***Вялес:*** Хай абярэ годнага сярод нас.
***Жыжаль:*** Кожны з нас варты гэтага.
***Пярун:*** Прыміце ў дар каштоўныя падарункі. */Жабяняты выносяць залатую клетку са штучнай птушкай, гучыць механічная мелодыя салаўя/*

***Дачка Свіслач:*** Ды птушка ў цябе штучная */смяецца/*, не жывая. І каханне будзе гэтакім жа. */Жабяняты выносяць клетку з птушкай./*
***Дочкі*** */разам/:* Ах!
***Вялес:*** Прыміце ў дар манеты залатыя.
***Дачка Свіслач:*** Каханне нельга купіць, не патрэбна мне тваё золата.
***Дочкі*** */ гавораць наперабой/:* А нам патрэбна, колькі золата, ах!
***Жыжаль:*** Прыміце ў дар камяні каштоўныя з нетраў зямлі!
***Дачка Свіслач:*** Эй, самахвал! Забірай іх з сабой. Камяні твае нікому не патрэбны. Бо сэрца ў цябе з каменя.
***Пярун:*** Ну што ж, Свіслач, ты сама гэтага захацела. Мы праклінаем цябе.
***Вялес:*** Ты ніколі не зможаш выйсці замуж за бога. А ў жонкі мы возьмем іншых.

*/Дочкі Вадзяніка становяцца каля багоў/*

***Жыжаль:*** Я, цябе, Свіслач, ператвараю ў брудную канаву, каб ніхто не бачыў тваёй прыгажосці, у цябе будуць зліваць адходы і кідаць смецце.

*/Гук вядзьмарства. Жабяняты накрываюць дачку Свіслач цёмнай тканінай з прымацаваным на ліпучку смеццем./*

***Пярун:*** Вызваліць цябе зможа толькі чалавек!
***Вялес:*** На сцяжынках яго чакаюць перашкоды і выпрабаванні.
***Жыжаль:*** Ён павінен іх пераадолець!
***Усе богі:*** Хай будзе так. Жонкі за намі.

*/Богі выбіраюць сабе жонак і адводзяць іх. Вадзянік злуецца, што ён нічога зрабіць не можа.Жабяняты спяваюць два куплеты песні «Рэчанька»/*

Ой, рэчанька, рэчанька, чаму ж ты няпоўная,
Лю-лі лю-лі лю-лі, чаму ж ты няпоўная.

Чаму ж ты няпоўная, з беражком няроўная.
Лю-лі лю-лі лю-лі з беражком няроўная.

*/Гук званочка./*

***Жабяня 1:*** Ваша высокасць, да Вас адзін чалавек.
***Вадзянік:*** Чалавек? Няхай заходзіць.
***Прынц Менеск:*** Мяне завуць прынц Менеск, я ўбачыў вашу дачку Свіслач і адразу пакахаў яе. Я прыйшоў прасіць рукі вашай дачкі.
***Вадзянік:*** Дарагі мой! Загінула наша Свіслач, богі заваражылі яе. Трэба прайсці перашкоды і выпрабаванні, каб яна зноў вярнулася да нас.
***Прынц Менеск:*** Я гатовы! Бо я, яе кахаю, яна дапамагае людзям! Тым больш, побач са мной мае сябры і яны нам дапамогуць.
***Усе жабяняты:*** І мы таксама табе дапаможам.
***Жабяня 2:*** Зараз мы ўсе станцуем танец сяброўства і пойдзем ратаваць Свіслач.
***Прынц Менеск:*** Сябры мае, устаньце, калі ласка, са сваіх месцаў і ўсё дружна паўтарайце за намі.

*/Танец-гульня «Мы сябры» з залай/*

Усе разам мы прысядзем – 1, 2, 3.
А цяпер усе мы ўстанем – 1, 2, 3.
Мы павернемся вось гэтак – 1, 2, 3.

Ды танцуюць ручкі ў дзетак – 1, 2, 3.
Звонка пляскаем рукамі – 1, 2, 3.
Гучна тупаем нагамі – 1, 2, 3.
А цяпер мы пасмяемся хі-хі-хі.
Уратуем рэчку Свіслач ад бяды.

*/Паўтараецца тры разы, з паскарэннем. Спасылка для запампоўкі музычнага файла танца-гульні «Мы-сябры»* https://disk.yandex.ru/d/NoCEDBp-m8-Npw/

***Жабяня 3:*** Малайцы, добра танцавалі, сядайце на свае месцы.

***Жабяня 4:*** Сябры, вы павінны выканаць два выпрабаванні.

***Прынц Менеск:*** Мы гатовыя да цяжкасцяў, мы іх не баімся.

***Жабяня 5:*** Першае выпрабаванне. Адкажыце, што гэта за знакі. */Жабяняты па чарзе паказваюць знакі аб паводзінах ў прыродзе. Гледачы павінны расказаць, што кожны знак значыць./*



*Правільны адказ:* Нельга раскідваць мурашнік



*Правільны адказ:* Не трэба разрываць павуціну і знішчаць павукоў, яны карысныя.



*Правільны адказ:* Не лаві прыгожых насякомых



*Правільны адказ:* Не кідайце смецце ў вадаёмы.



*Правільны адказ:* Не чапай птушанят ні ў гнязде, ні на зямлі.



*Правільны адказ:* Не ламай галінкі дрэў.



*Правільны адказ:* Не шкодзь ягадныя кусцікі і не вырывай



*Правільны адказ:* Не чапай птушыныя гнёзды, не падыходзь да

іх з каранём.                    іх блізка.

***Жабяня 6:*** Малайцы! Вы справіліся з першым выпрабаваннем.

***Прынц Менеск:*** Давайце гучна папляскаем і скажам дружна: «Мы малайцы! Ура!»Тры чатыры... */Гледачы выконваюць заданне./*

***Жабяня 1:*** Выпрабаванне другое. Вы павінны ачысціць рэчку ад смецця.

*/Ідзе гульня «Ачысці рэчку». З залы выбіраецца два-чатыры ўдзельнікі, якія павінны як мага хутчэй сабраць смецця ў пакеты – ачысціць рэчку. Пасля гульні гучыць музыка. Свіслач скідае з сябе брыдкае адзенне і бяжыць да Прынца Менеска./*

***Дачка Свіслач:*** Дзякуй табе, прынц Менеск, ты выратаваў мяне.

***Прынц Менеск:*** Мне дапамаглі мае сябры і Жабаняты. Сяброўства і каханне робяць цуды. Дзякуй мае сябры, што вы дапамаглі ачысціць нашу рэчку і вызваліць маю каханую, займайце свае месцы ў глядзельнай зале.

*/Гледачы займаюць сваі месца ў глядзельнай зале./*

***Прынц Менеск:*** Скажы, ты станешь маёй жонкай?

***Усе жабаняты:*** Да, да, да!

***Дачка Свіслач:*** Але ты чалавек!

***Прынц Менеск:*** Я кахаю цябе, Свіслач, і заўсёды буду кахаць, клапаціцца і захоўваць цябе. І сваім людзям накажу, каб яны шанавалі цябе ўсё жыццё.

***Дачка Свіслач:*** Я так сама цябе кахаю. Я здольна выйсці за цябе замуж. А дзе мой дарагі бацька? Тата, тата!

*/Выбягае Вадзянік./*

***Вадзянік:*** Я такі задаволены! Я згоден, дачка мая любая. Жабяняты, рыхтуемся да свята, згуляем вяселле.

***Усе жабаняты:*** Вяселле! Вяселле!

*/Усе пакідаюць сцэну. Выходзіць Дзед- Барадзед./*

***Дзед Барадзед:*** Я Дзед- Барадзед,
Я казачны гном.
Я Дзед- Барадзед,
Усім дзецям знаёмы!
Прынц рэчку Свіслач з сабою забраў,
Шанаваў і кахаў ён, слова трымаў!

Ну, вось і казцы нашай заканчэнне. А хто ў казцы пабываў… Малайчына!

*/Усе дзеючыя асобы выходзяць і спяваюць песню/*

Вось казка і канчаецца,
І гледачы збіраюцца дамоў.
А мы зноў пойдзем вандраваць
І казкі новыя шукаць
Ізноў.
А вам жадаем поспехаў
І ў кожнай справе зычым перамог.
Жадаем долі шчаснае,
Хай зоры будуць ясныя,
Здароўя і шчаслівых вам дарог!
Здароўя і шчаслівых вам дарог!

**Спіс выкарыстанай літаратуры:**

Беларуская міфалогія: Дапам. / Уклад. У.А. Васілевіч. – 2-е выд. – Мн.: Універсітэцкае, 2002. – 208 с.

Доброта : Песни для детей: Для пения (соло, ансамбль, хор) без сопровожд. / Составитель Н.М. Шкилева. – Минск : Беларусь, 1985. – 127 с.

Шамак, А. А. Міфалогія беларусаў / Алесь Шамак. – Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2013. – 255 с.